# Сучасныя падыходы да правядзення ўрокаў пазакласнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

***I месца ў намінацыі «Ад педагагічных ведаў — да педагагічнага майстэрства» Мінскай гарадской панарамы метадычных ідэй «Урок для педагога»***

***Мэта:*** вызначыць напрамкі і спосабы ўдасканалення і аптымізацыі ўрокаў пазакласнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

***Задачы:*** 1) аптымізаваць работу па адборы зместу для вучэбных заняткаў пазакласнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі; 2) вывучыць метады і прыёмы, якія садзейнічаюць стварэнню станоўчай матывацыі да самастойнага чытання; 3) пазнаёміць з нестандартнымі формамі правядзення вучэбных заняткаў пазакласнага чытання; 4) вызначыць найбольш прадуктыўныя метадычныя прыёмы і віды заданняў для фарміравання чытацкай самастойнасці вучняў пачатковых класаў на вучэбных занятках пазакласнага чытання.

***Форма правядзення:*** метадычны мост.

***Удзельнікі:*** настаўнікі пачатковых класаў, студэнты факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, намеснік дэкана факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, пісьменнік, кампазітар, загадчыца дзіцячай бібліятэкі.

***Месца правядзення:*** дзіцячая бібліятэка.

***Метадычнае забеспячэнне:*** мультымедыйная прэзентацыя, раздатачны метадычны матэрыял.

**I. Уводзіны**.

Паважаныя калегі, наш метадычны мост прысвечаны актуальнай тэме — арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання. Мы вызначым напрамкі і спосабы ўдасканалення ўрокаў пазакласнага чытання. Для гэтага разгледзім, як аптымізаваць работу па адборы зместу для вучэбных заняткаў, абмяркуем, як матываваць дзяцей да самастойнага чытання, узгадаем нестандартныя формы правядзення ўрокаў пазакласнага чытання і вызначым найбольш прадуктыўныя прыёмы, якія фарміруюць чытацкую самастойнасць.

Сёння кампетэнтнасны падыход у навучанні і выхаванні садзейнічае падрыхтоўцы вучняў да самаадукацыі, а педагагічныя тэхналогіі накіраваны на дзейнасны падыход у навучанні. Пазакласнае чытанне з'яўляецца працэсам самаадукацыі. Гэта перш за ўсё дамашняе чытанне, чытанне па-за падручнікам. У вучэбнай праграме прадугледжаны гадзіны на арганізацыю заняткаў пазакласнага чытання, вызначаны спіс твораў, рэкамендаваных для пазакласнага чытання, выкладзены патрабаванні да аб'ёму і афармлення дзіцячай кнігі, вызначаны віды самастойнай чытацкай дзейнасці, формы індывідуальнай і групавой работы з кнігай у пазаўрочны час, пералік асноўных ведаў і ўменняў работы з дзіцячай кнігай.

**II. Асноўная частка.**

1. Якім павінен быць сёння ўрок пазакласнага чытання? (Адказваюць настаўнік, студэнт, пісьменнік, загадчыца дзіцячай бібліятэкі.)

Мы прапанавалі гэта пытанне і дзецям. Пазнаёмцеся з іх думкамі. (Дэманстрацыя відэароліка.) *Такім чынам, урок пазакласнага чытання павінен быць **цікавым, сучасным, займальным, нестандартным, яркім, творчым**, добра, калі **прысутнічаюць пісьменнікі і кампазітары**.*

2. У вучэбнай праграме прапанаваны спіс літаратурных твораў для пазакласнага чытання ў адпаведнасці з тэматыкай вучэбнага раздзела. Пераважаюць творы сучасных пісьменнікаў. Што неабходна ўлічыць, каб выбраць з прапанаванага ў праграме матэрыял для свайго ўрока пазакласнага чытання? (Адказвае настаўнік.) Якія аўтары, кнігі, жанры больш запатрабаваны ў дзіцячай бібліятэцы? (Пытанне да загадчыцы бібліятэкі.) Аб чым пішуць сучасныя аўтары для дзяцей? (Пытанне да пісьменніка.)

Мы правялі анкетаванне вучняў III–IV класаў для выяўлення чытацкіх інтарэсаў. На пытанне «Ці любіш ты чытаць па-беларуску?» 90 % дзяцей адказалі «так» ці «іншы раз». Чытаюць у асноўным на выхадных. Больш любяць невялікія па аб'ёме творы, вершы, артыкулы з энцыклапедый. Кнігі бяруць у дамашняй, школьнай (большасць), пазашкольнай бібліятэках. Чытаюць для таго, каб шмат ведаць. Дзяцей цікавіць свет кнігі. *Такім чынам, пры выбары твораў для свайго ўрока мы ўлічваем наступнае: **наяўнасць твораў**, прапанаваных праграмай, у бібліятэцы, на інтэрнэт-сайтах; **адпаведнасць узросту і асаблівасцям дадзенага класа, інтарэсам дзяцей**; трэба выбіраць яркія, запамінальныя творы з акрэсленым сюжэтам; героямі твораў могуць быць равеснікі; важна наяўнасць кніг для калектыўнага чытання.*

3. З аналізу анкет відаць, што толькі 44 % вучняў ахвотна самастойна чытаюць. Як жа нам матываваць дзяцей на сістэматычнае самастойнае чытанне? Прапануем прыёмы са свайго вопыту.

У нас у гасцях аўтары цудоўнай калыханкі «Начавала ночка» Уладзімір Мазго і Валянцін Каваліў.

Гэты твор мы прапанавалі дзецям для ілюстравання. У выніку атрымаўся відэаролік. Праведзеная праца выклікала зацікаўленасць творчасцю пісьменніка. А сам ролік зможа выклікаць інтарэс і іншых дзяцей. Цікава даведацца ў кампазітара яго меркаванне пра тое, як маленькім чытачам музыка можа дапамагчы спасцігнуць змест вершаванага твора.

Прапануем паглядзець відэаролік. Падчас прагляду роліка падкрэсліце ў тэксце песні тыя радкі, што знайшлі сваё адлюстраванне ў малюнках дзяцей. (Дэманстрацыя відэароліка.) Зачытайце падкрэсленыя вамі радкі.

Вопытам сваёй дзейнасці па рэкламе кнігі прапануем падзяліцца настаўніцы вышэйшай катэгорыі, прызёру гарадскога конкурсу «Сучасны ўрок беларускай мовы» А. А. Сакалянскай (дадатак 1).

Яшчэ адзін цікавы новы прыём рэкламы кнігі — буктрэйлер. Буктрэйлер (англ. *booktrailer*) — гэта невялікі відэаролік, які расказвае ў адвольнай мастацкай форме пра нейкую кнігу. Мэта такіх ролікаў — рэклама новых кніг і прапаганда чытання, прыцягненне ўвагі да кніг пры дапамозе візуальных сродкаў. Працягласць буктрэйлера не большая за тры хвіліны.

Этапы стварэння буктрэйлера (у вашых памятках):

1. Выбар кнігі.
2. Прагляд узораў буктрэйлераў і стварэнне сваёй ідэі.
3. Напісанне сцэнарыя да роліка (10–15 сказаў). Падбор ілюстрацый, відэаматэрыялаў: па адным кадры да кожнага кароткага сказа, па 2–3 — да доўгіх сказаў. Фармуляванне ў загалоўку трэйлера асноўнай ідэі кнігі.
4. Запіс неабходных аўдыяматэрыялаў.
5. Аб'яднанне візуальных і аўдыяматэрыялаў у адзіны ролік з выкарыстаннем праграмнага забеспячэння.
6. Прагляд буктрэйлера, пры неабходнасці карэкціроўка.
7. Дэманстрацыя і аналіз уздзеяння роліка на гледачоў.

Падчас прагляду буктрэйлера падумайце, ці зможа ён зацікавіць дзяцей да чытання кнігі. Што, магчыма, можна змяніць? (Дэманстрацыя буктрэйлера да кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Казкі сіняй падушкі».) Ці зможа такі буктрэйлер зацікавіць да чытання кнігі? Што можна змяніць у ім? *Такім чынам, сёння можна матываваць дзяцей да самастойнага чытання з дапамогай **візуальных сродкаў, відэаролікаў, буктрэйлераў**, таму што гэта адпавядае іх узроставым асаблівасцям і зацікаўленасцям. Вельмі значнымі з'яўляюцца **сустрэчы з аўтарамі**, а таксама стварэнне ўмоў для **рэалізацыі творчых здольнасцей дзяцей у маляванні, спевах і літаратурнай творчасці**.*

4. У пачатку сустрэчы ўсе пагадзіліся з тым, што вучэбныя заняткі пазакласнага чытання павінны быць цікавымі і нестандартнымі. Асноўныя формы правядзення: урок, экскурсія ў бібліятэку, літаратурны ранішнік, вусны часопіс, літаратурны конкурс, сустрэча з дзіцячым пісьменнікам.

Цікавы вопыт правядзення ўрокаў пазакласнага чытання назапашаны ў педагагічным універсітэце ў рамках рэалізацыі праекта «Ад культуры чытання — да культуры асобы». Удзельнікамі гэтага праекта былі і мы. Прапануем І. А. Буторынай, намесніку дэкана факультэта пачатковай адукацыі педагагічнага ўніверсітэта, расказаць пра найбольш прадуктыўныя формы арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання. *Такім чынам, вопыт паказвае, што кожны настаўнік павінен быць у пастаянным **пошуку новых форм правядзення вучэбных заняткаў пазакласнага чытання ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі**.*

5. Прапаную спыніць нашу ўвагу на прадуктыўных прыёмах фарміравання кампетэнтнага чытача. Вопытам сваёй дзейнасці падзеліцца М. У. Байманаліева (дадатак 2). Цікавы прыём працы «Філворд» прапануюць і студэнты педагагічнага ўніверсітэта (дадатак 3). *Такім чынам, **актыўныя метады і прыёмы навучання найбольш дзейсныя**. Трэба імкнуцца выкарыстоўваць менавіта іх.*

**III. Падвядзенне вынікаў.**

Прапаную ўсім падвесці вынікі сённяшняга метадычнага моста. Лічу, што пастаўленыя задачы былі рэалізаваны. Сваё меркаванне прапаную выказаць у розных формах: аўтары, магчыма, падораць нам невялічкі твор; бібліятэкар прапануе магчымыя формы супрацоўніцтва; студэнты складуць сінквейн; настаўнікі праз прыём «Пісьмо па крузе» адкажуць на пытанне «Вучэбныя заняткі пазакласнага чытання будуць карысным, калі...».

*Дадатак 1*

**Прыём «Рэклама кнігі»** для заахвочвання чытання мы амаль усе выкарыстоўваем у паўсядзённым жыцці. Чытаем кнігу, яна нам падабаецца, рэкламуем яе сябрам (па-рознаму: прапануем паглядзець спачатку фільм, расказваем пра аўтара, пра жанр кнігі, інтрыгуем пачаткам зместу). Так і ў вучэбнай дзейнасці — каб зацікавіць дзяцей, заахвоціць да чытання, мы глядзім іншы раз фільм, мультфільм, расказваем пра аўтара, чытаем пачатак, прапануем самастойна прачытаць працяг. Прапаную паслухаць і паглядзець рэкламу кнігі «Казкі дзядулі Дняпра» Генадзя Аўласенкі.

1. Бібліятэка № 9, яе супрацоўнікі арганізавалі для нас сустрэчу з Генадзем Пятровічам і запрасілі ў госці. Пісьменнік распавядаў дзецям пра сябе і свае творы, знаёміў з кнігай «Казкі дзядулі Дняпра», з яе пабудовай. Расказаў, што сам быў настаўнікам біялогіі, ведае шмат цікавага пра звяроў і птушак. І таму ў кнізе даў цікавыя энцыклапедычныя звесткі пра рэкі, звяроў, птушак Беларусі.
2. Потым мы ўзялі гэтую кнігу ў бібліятэках № 9 і № 11, бацькі куплялі кнігі, нават ксеракапіравалі. Бо першая ўмова: для таго, каб прачытаць кнігу, трэба яе мець.
3. Некалькі казак мы чыталі сумесна (настаўнік — энцыклапедычныя звесткі, дзеці — казку). Умова другая: каб падабалася чытаць, трэба разумець, што чытаем. Таму наступны этап — слоўнікавая работа (розныя віды). На дошцы малюнкі — мы шукаем словы ў казцы, гульня «Перакладчык», гульні «Рэдактар», «Аўтар памыліўся».
4. Наступны этап — праверка разумення зместу, галоўнага, маралі. Віктарыны.
5. Падзяліліся на групы. Выбралі капітана. 1-я група чытала казку «Адкуль жук-алень узяўся»; 2-я група — казку «Чаму ў зубра горб?».
6. На стымулюючых занятках групы працавалі па асобку з настаўнікам. Разам чыталі казку, адказвалі на пытанні, правялі слоўнікавую работу, выконвалі заданні з зорачкамі. І калі ўсе ўжо добра ведалі казку, разам

састаўлялі рэкламу. Малявалі плакат, прыдумвалі дэвіз каманды, вершаваную частку рэкламы. Трэніраваліся прадстаўляць казку і рэпеціравалі песню. І толькі потым на ўроку пазакласнага чытання каманды прадстаўлялі казкі.

*Дадатак 2*

**Прыёмы фарміравання чытацкай граматнасці вучняў на ўроках пазакласнага чытання.** Вельмі важна навучыць дзяцей уважліва чытаць, самастойна аналізаваць і супастаўляць, вызначаць сюжэтную лінію, бачыць перспектыву ў развіцці сюжэту. Для гэтага прымяняецца шэраг прыёмаў. Прапаную папрацаваць з апавяданнем Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Вітаміны ад грыпу». Для фарміравання ўмення будаваць гіпотэзы, звязаныя з развіццём сюжэтнай лініі ў тэксце, мэтазгодна выкарыстоўваць ***прыём «Дрэва прадказанняў»***. Сутнасць прыёму ў мадэляванні фіналу зададзенага тэксту. Паслухайце пачатак апавядання «Вітаміны ад грыпу» і падумайце, якім будзе фінал гэтага апавядання.

*Ваня лёг раней спаць, каб хутчэй надышла доўгачаканая субота. Нарэшце можна будзе апрабаваць новы футбольны мяч.*

*Прачнуўся раніцай сам. Без будзільніка, і пайшоў на кухню. Здзівіўся, калі не ўбачыў там мамы. Звычайна ў гэты час яна завіхалася каля пліты, гатавала сняданак.*

*— Сынок! — паклікала мама са спальні. — Ты ўжо ўстаў?*

*Ваня зазірнуў да мамы. Бледная, яна сядзела на ложку, прыкрыўшыся коўдрай.*

*— Захварэла я, сынок, — сказала мама. — Грып, мусіць. Не падыходзь блізка.*

*Ваня занепакоіўся:*

*— Не ўставай, мамачка! Зараз я табе чаю сагрэю.*

*Мама папіла чаю з варэннем, падзякавала і папрасіла:*

*— Пакармі Наташку, сынок. І на рынак схадзі, купі малака, каўбасы, гародніны, каб і на заўтра вам хапіла.*

*— Добра, мамачка. Усё зраблю, — запэўніў Ваня. — Я ж не ў дзіцячы садок хаджу!..*

*Праз гадзіну Ваня выйшаў з дому. З сабой узяў не толькі грошы, але і футбольны мяч.*

Калегі, якім жа будзе фінал апавядання?

Паслухайце фінал апавядання.

*На вуліцы сказаў сябрам:*

*— Гуляйце без мяне ў футбол. Я на рынак іду.*

*Вельмі хацелася Ваню далучыцца да сяброў. Але дома чакалі хворая мама і маленькая сястрычка, і ён аддаў мяч сябрам.*

*На рынку ўсяго было так багата, што аж вочы разбягаліся. Ваня доўга прыглядаўся, выбіраў. Дадому вярнуўся задаволены.*

*На кухні паклаў усё, што купіў, на вялікі паднос і прынёс маме.*

*— Каму гэта? — здзівілася мама, убачыўшы на падносе бананы, апельсіны, вінаград.*

*— Табе, мамачка. Вітаміны ад грыпу! Каб хутчэй ачуняла.*

*— Ты ж усе грошы патраціў, сынок. Што ж вы з Наташкай есці будзеце?*

*— Хопіць і нам, мамачка, — супакоіў Ваня. — У халадзільніку яшчэ каўбаса засталася, сыр ёсць, агуркі салёныя. Я звару бульбу.*

*На маміны вочы набеглі слёзы.*

*— Які слаўны ў мяне, сынок! Сапраўдны гаспадар!..*

*Выхадныя, субота і нядзеля, прайшлі не так, як думаў Ваня. Але ён не зайздросціў сябрам: прыемна быць гаспадаром у сваім доме.*

Для развіцця чытацкай уважлівасці мэтазгодна выкарыстоўваць ***прыём «Лаві памылку»***. Сутнасць яго ў выпраўленні неадпаведнасцей у сціслым змесце тэксту ці фрагменце тэксту. Знайдзіце памылкі ў прапанаваным вам тэксце.

*Ваня лёг раней спаць, каб хутчэй надышла нядзеля. Можна будзе апрабаваць новы футбольны мяч.*

*Прачнуўся раніцай і пайшоў на кухню. Звычайна ў гэты час мама чытала кніжку. Яе не было. Мама са спальні паклікала Ваню.*

*Хлопчык заглянуў да мамы. Бледная, яна сядзела на канапе.*

*— Захварэла я, сынок, — сказала мама.*

*Ваня занепакоіўся:*

*— Не ўставай, мамачка! Зараз я табе чаю сагрэю.*

*Мама папіла чаю з лімонам, падзякавала і папрасіла:*

*— Пакармі Наташку. І на рынак схадзі, купі малака, каўбасы, садавіны.*

*— Добра, мамачка. Усё зраблю, — запэўніў Ваня.*

*Праз гадзіну Ваня выйшаў з дому з футбольным мячом.*

Выкарыстанне ***прыёму «Куфэрачак»*** дапамагае развіваць уменні выдзяляць галоўнае, абагульняць і супастаўляць літаратурныя творы і характарыстыкі герояў. На лістку запішыце адну характарыстыку галоўнага героя Вані. (Зачытваюцца ўсе характарыстыкі.) Такім чынам, відавочна, што вядучыя рысы характару Вані — клапатлівасць, дабрыня, чуласць. Гэтыя рысы называліся часцей.

Выкарыстанне ***прыёму «Інтэрпрэтацыя»*** дапамагае развіваць літаратурнае ўяўленне вучняў, вызначаць аўтара і лірычнага героя твора. Прапаную вам стаць удзельнікам падзей, пра якія расказана ў апавяданні, і сцісла пераказаць сюжэт апавядання ад свайго імя. (Пераказ.) Гэты прыём можа быць прадстаўлены і іншымі заданнямі: зрабіць героя антыгероем, скласці апавяданне ці казку па зададзеных прадметах ці персанажах.

Усе пералічаныя прыёмы дапамагаюць сфарміраваць кампетэнтнага чытача.

*Дадатак 3*

Для арганізацыі работы са словам мэтазгодна выкарыстоўваць **прыём «Філворд»**. Філворд — адзін з відаў красворда. Пры яго разгадванні неабходна ўпісваць адказы ў сетку з расстаўленымі літарамі, калі дакладней, то не ўпісваць, а выкрэсліваць. Гэта вельмі падобна да англійскага красворда, але ёсць два прынцыповыя адрозненні — словы могуць чытацца не толькі па вертыкалі ці гарызанталі, але і выгінацца, як змеі, а кожная літара не можа належаць двум або большай колькасці слоў. У філвордзе няма заштрыхаваных клетак, а ўсе літары ўжо прыведзены. Неабходна адшукаць словы, да якіх даюцца азначэнні. Пасля выкрэслівання ўсіх слоў пустых клетак застацца не павінна. Настаўнік у адпаведнасці з класам можа вызначыць узровень складанасці філворда.

Прапаную папрацаваць з апавяданнем Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Вітаміны ад грыпу».

1. На што захварэла мама?
2. Любімая гульня сына.
3. Якую садавіну прынёс сын для маці?

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ф | у | т | б | о | л | ы | г |
| в | а | б | а | н | а | н | р |
| і | п | е | л | ь | с | і | ы |
| н | а | г | р | а | д | н | п |

***Аброськіна Т. Ю.**, настаўнік пачатковых класаў;*
***Зяневіч А. М.**, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце.*
*Сярэдняя школа № 43 г. Мінска*